**17 мая 2017 года** ў Каледжы бізнесу і права адбылося паседжанне Мінскага гарадскога метадычнага аб’яднання выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры.

**Тэма паседжання**
**“Бінарны ўрок як сродак фарміравання цэласнага ўспрыняцця навучальнага матэрыялу”**

**Мэта паседжання:** Спрыяць павышэнню педагагічнага майстэрства выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры праз абмен вопытам па правядзенні бінарных урокаў

На паседжанні прысутнічалі 24 выкладчыкі каледжаў г. Мінска і Мінскай вобласці

Напрыканцы паседжання былі падведзены вынікі. Прысутныя абмяняліся думкамі, выказаўшы зацікаўленасць тэмай паседжання, а таксама адзначылі высокі метадычны ўзровень падрыхтоўкі і правядзення прадэманстраваных адкрытых урокаў.

**ПРАГРАМА ПАСЕДЖАННЯ**

***Адкрыццё паседжання градского метадычнага аб’яднання***

*Савіцкая Ніна Антонаўна,* метадыст Мінскага гарадскога Савета кіраўнікоў каледжаў, прывітала прысутных і расказала пра работу гарадскіх метадычных аб’яднанняў у бягучым 2016/2017 навучальным годзе.

*Малафей Ірына Васільеўна,* намеснік дырэктара па навучальнай рабоце, пазнаёміла з гісторыяй і дасягненнямі каледжа, расказала пра спецыяльнасці, па якіх праводзіцца падрыхтоўка спецыялістаў на сённяшні дзень.

*Фалей Алена Уладзіміраўна,* старшыня цыклавой камісіі дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыклу, прадставіла выкладчыкаў цыклавой камісіі і азнаёміла з асноўнымі накірункамі работы. Таксама былі акрэслены прычыны цікавасці выкладчыкаў да бінарных урокаў і некаторыя асаблівасці арганізацыі і правядзення такіх заняткаў.

***Адкрыты ўрок па тэме “Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі. Маральны подзвіг галоўнага героя апавядання Янкі Брыля “Memento mori”***

*Васіленка А.М.* – выкладчык беларускай мовы і літаратуры;

*Алай А.С.* – выкладчык гісторыі;

***Паэтычна-музыкальная імпрэза “Думкамі аб Беларусі”, прысвечаная 135-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы***

*навучэнцы каледжа*

***Адкрыты ўрок па тэме “Турызм у Рэспубліцы Беларусь. Выразнасць і багацце маўлення”***

*Рагуновіч І.М.* – выкладчык беларускай мовы і літаратуры

*Шавярноўская Я.І.* – выкладчык замежнай мовы.


Якімі былі мэты
супраць СССР?
Калі тэрыторыя
акупавана германскімі


БАГАЦЦЕ І ВЫРАЗНАСЦЬ
МАЎЛЕННЯ
OF





